# ФІЛАЛОГІЯ

*Паэзіі краса і сіла*

Паэму "Яна і я" Янка Купала напісаў у Акопах у 1913 г. Гэтае месца — знакавае для творчасці Янкі Купалы, яго духоўная калыска. Акопы сталі для песняра тым самым, што Мікалаеўшчына і яе ваколіцы для Якуба Коласа, Наваградак для Адама Міцкевіча, Міхайлаўскае для Аляксандра Пушкіна, Ясная Паляна для Льва Талстога. Сюды (маці і сёстры арандавалі тут хутар) паэт упершыню прыехаў у 1911 г., калі быў студэнтам агульнаадукацыйных курсаў А. Чарняева ў Пецярбургу. І першы раз убачыўшы гэтую мясціну, яе краявіды — цёмныя лясы, прыгожыя сонечныя паляны, крутыя яры, гаманкія ручаінкі, велічныя валуны, — палюбіў яе на ўсё жыццё. Янку Купалу вабіла прырода Акопаў. Ды і блізкія рабілі ўсё, каб яму тут добра адпачывалася. І пісалася. У гэтым цудоўным маляўнічым кутку Лагойшчыны паэт напісаў больш за 80 твораў грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай, інтымнай лірыкі. Вершы пісаліся адзін за адным, часам па 200 — 300 радкоў у дзень. Сярод іх "Песня мая", "Жняя", "Гэй, наперад!..", "Як у лесе зацвіталі...", "За свабоду сваю...", "Зоркі", "Над ракою ў спакою", "Не шукай...", "З вячэрніх дум", "Тутэйшы", "Лясное возера", "Над калыскай", "А зязюлька кукавала...", "Па Даўгінаўскім гасцінцы...", "За ўсё...", "І прыйдзе...", "Улетку", "Перад будучыняй", "Аб дзяўчыне", "Праз гультайства...", усе п'есы, паэмы "Бандароўна", "Магіла льва", вершаваны пераклад "Слова аб палку Ігаравым"... А многія творы хоць і не маюць пазнакі месца напісання, але выспелі менавіта ў Акопах.



Янка Купала. 1913 г.

Жанна ШАЛАДОНАВА

## "РАЕМ НА ЗЯМЛІ ВЫГЛЯДЫВАЎ НАМ САД..."

### ДУХОЎНА-ЭСТЭТЫЧНАЯ ПРАСТОРА ПАЭМЫ "ЯНА І Я" ЯНКІ КУПАЛЫ

На драматычным фоне рамантычных купалаўскіх твораў асобнае месца належыць паэме "Яна і я", у якой паўнакроўна, маштабна і шматпланава рэалізавана аўтарская эстэтычная канцэпцыя жыцця. Твор мае падзагаловак "Песня зямлі і жыцця", які акрэслівае аксіялагічны ракурс успрымання жыццёвых з'яў. Пры гэтым вырашаюцца ідэйна-мастацкія задачы ўзвысіць, апець самакаштоўны і гарманічны свет, неба і зямлю, выявіць іх як крытэры самаспазнання чалавека, яго духоўна-творчай рэалізацыі і быццёвага здзяйснення:

*Раем на зямлі выглядываў нам сад,*
*Я ў ім – Адам, яна ў ім – Ева;*
*У раі гэтым вецер быў нам Бог і сват,*
*Вяцьвямі шлюб давала дрэва*[1].

Для стварэння бездакорных ідылічных палотнаў Янка Купала ўзнімаецца над побытавай эмпірыкай штодзённасці, перайначвае рэальнасць у падабенства Райскага Саду – Эдэму – утульнага, адасобленага і зацішнага, не кранутага цяжкасцямі, трывогамі і супярэчнасцямі, дзе паўнапраўна ўладарыць каханне, гармонія, прыгажосць.

Аднак такі высокі палёт паэтычнай фантазіі не азначае дрыготкай нематэрыяльнасці, бясплоцевасці, містычнасці свету мары. Паэма насычана каларытнай эстэтыкай жыцця і працы, цёплай энергетыкай шчырых, чароўных чалавечых пачуццяў. У ёй таксама паказаны шчодрыя, яскравыя фрагменты народных звычаяў, прыкмет, абрадаў. Нягледзячы на вонкавае пазбяганне ўмоўнасцяў і звыклых абавязкаў, рэгламентацыю дзеянняў, адсутнасць нейкіх знешніх абмежаванняў у паводзінах герояў, якія жывуць нязмушаным і непасрэдным, вольна-прыродным жыццём, твор напоўнены высокай духоўнасцю адносінаў, традыцыйнай народнай мараллю і этыкай.

Усё гэтае свята жыцця адбываецца на ўлонні маляўнічага, вельмі шчодрага і насычанага пейзажу, які і надае дзеянню сапраўды касмічны размах і магутную вітальную сілу:

*Выйшлі з ёй, дзе сенажатная краса*
*Зіхцела, як вясёлкі мнагацветны ўзор,*
*Вострая яшчэ дзе не забразгала каса,*
*Дзе ў кветках луг ірдзеў, як неба ўноч ад зор.*

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Краскамі ўсміхаецца ўся сенажаць,*
*Гараць урочнікі, румянкі і званкі.*
*Жоўтыя званцы зялёны луг жаўцяць,*
*На кветку з кветкі шыбка скачуць матылькі.*

*Рэчка бурбаліць па каменнях між волых,*
*Вадзіца бліскатна лялее ў бегацьбе,*
*Сціха штосьці шэпча, шалясціць трыснёг,*
*А сонца сочыць у вадзе само сябе* (118).

Праз паэтычныя погляды на прыроду выяўляецца філасофская пазіцыя рамантыкаў, аснова іх светапогляду, спосабу творчага ўспрымання і адлюстравання з'яў рэчаіснасці. Для рамантыкаў прырода была прадметам захаплення, сакралізацыі. Увасабленне гэтых пачуццяў у паэме дасягае сапраўднага апагею праз зліццё натуральна-прыроднага пачатку і чалавечай духоўнасці. Навакольны свет увысакароднены прысутнасцю чалавека, яго жывым, прачулым, зацікаўленым удзелам. Праз яднанне прыроды і чалавечага "я" пейзажныя замалёўкі змяшчаюць у сабе важныя псіхалагічныя адкрыцці, абагульненні. У паэме "Яна і я" гэты мастацкі прыём дазваляе перадаць стан разняволенага чалавечага духу ў яго стваральна-адраджэнскай скіраванасці, маральна-этычнай напоўненасці, прынцыповым непрыманні спрошчанасці, аднамернасці, статычнасці. Менавіта такі эмацыйна-псіхалагічны эфект нясе велічнае харастсво прыроднай стыхіі ў насычанай, багатай гаме фарбаў.

На старонках твора Янка Купала выяўляе сваю паэтычна-маляўнічую пранікнёнасць, здольнасць бачыць непаўторныя дэталі, каларытныя падрабязнасці, перадаваць іх насычаную прыгажосць, неўтаймоўную жыццёвасць. Мастацкі свет паэмы, шчодры на фарбы, колеры, гукі, пачуцці, увасабляе высокую духоўнасць, культуру, свабоду. Ён адпаведны ўрачыста-прыўзнятай велічы адраджэнскага патэнцыялу эпохі:

*Вясна, вясна! О, колькі ў табе шчасця!*
*О, колькі радасці прыносіш ты з сабой!*
*Умееш ты ў душы агонь раскласці*
*І грудзі распаліць агністай барацьбой.*

*Святлом свет цэлы заліла гарачым,*
*Раскінула з зялёнасці жывы шацёр,*
*На ўсім зямлі абшары доўгаспячым*
*На сваіх кроснах выткала чароўны ўзор.*

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

*Гэй, ажыло зямлі старое папялішча!*
*Зайгралі рэчкі, плечы выраўнаваў бор,*
*Спраўляе птушак жвавы рой ігрышча*
*І падлятае з радасцю чуць не да зор* (119).

Аналізуючы паэзію Янкі Купалы, літаратуразнаўца Валянціна Гапава асобна падкрэсліла яе пачуццёвую насычанасць і страснасць: «Прырода, каханне, песня – вось што ствapала купалаўскі свет. Нават рэчаіснасць "амшэлых хат" саступала перад музыкай, сонцам, трапяткім дыханнем страсці»[2]. Названыя ўласцівасці паўнакроўна, эстэтычна выразна, маляўніча ўвасобіліся ў паэме "Яна і я", дзе падаецца ўсё багацце і насычанасць асабістага жыцця чалавека, адбываецца своеасаблівае "паглыбленне" ў свет пачуццяў, уражанняў, эмоцый і такім чынам спасцігаецца аксіясфера.

Аднак, як мы бачым у паэме, унутраны свет асобы не абсалютны і дамінавальны. Ён арганічна ўзаемазвязаны з прыроднай існасцю, далучаны да няспыннага колазвароту, цыклічнасці прыродных працэсаў, сузалежны з імі. Згодна з мастацкай канцэпцыяй паэмы, чалавек і ў сваім звычайна-паўсядзённым клопаце, і ў насычаным пачуццямі ўнутраным жыцці ўтварае неад'емную і важкую частку натуральна-прыроднага быцця, далучаецца да ідэальнай бясконцасці свету.

Янка Купала ўвесь час падкрэслівае, што яднанне, узаемадзеянне адбываецца і на жыццёва-побытавым узроўні, і ў вяршынях творчага палёту думкі.

*Звінела песня і злівалась з музыкаю птушак,*
*Бярозавыя на гасцінцы плакалі прысады,*
*Заводзіў вецер, б'ючысь аб асінавы асушак...*
*Я выган плотам гарадзіў, яна палола грады* (116).

Мастацкія малюнкі паэмы пераконваюць, што беларускі пясняр імкнецца максімальна засяродзіцца на вяршынных праявах гэтай непарыўнай еднасці чалавека і прыроды, заўважыўшы ў ёй вытокі духоўнай гармоніі.

Гарманічныя суадносінасць, еднасць, усеадзінства – найважнейшы паказчык псіхалагічнай ураўнаважанасці, душэўнага камфорту, этычнай нормы, адпаведнасці натуральна-прадвызначанаму ходу быццёвых рэчаў і з'яў.

Адной з праяў духоўнага жыцця, гарантам быццёвай еднасці, цэласнасці, узаемадапаўняльнасці ў паэме выступае пачуццё кахання, якое і замацоўвае сувязь чалавека з прыроднай стыхіяй, перадае сутнасць, найважнейшыя тэндэнцыі існавання. Платон заўважыў: "Каханнем называюць прагу цэласнасці і імкненне да яе" ("Пір"). У паэме Янкі Купалы дасягнутыя ў каханні цэласнасць, адзінства набываюць касмічныя маштабы, выходзяць на універсальны ўзровень:



***Жанна Сяргееўна Шаладонава*** *— літаратуразнаўца. Кандыдат філалагічных навук (1998). Закончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1992) і аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларусі (1995). Старшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Аўтар кнігі «Фарбы быту і быцця ў паэме Якуба Коласа "Новая зямля"» (2001), адзін з аўтараў калектыўных зборнікаў "Нарысы беларуска-украінскіх літаратурных сувязей: Культурна-гістарычны і літаратуразнаўчы аспекты праблемы" (2002), "Беларуская літаратура ў кантэксце славянскіх літаратур XIX — XX стст." (2006). Лаўрэат прэміі Прэзідэнтаў Акадэмій навук Беларусі, Украіны, Малдовы (2003).*

*Птушкі ў мільён струн вяселле гралі нам,*
*Пасажнай маткай была пчолка,*
*Сонца несла ўцехі думкам і грудзям,*
*Пасцелю слала нам вясёлка.*

*Капаў нам на вочы яблыневы цвет,*
*На нас валіўся, як снег белы,*
*Мыслі нашы беглі сіняй далі ўслед*
*І свет сабой тулілі цэлы* (117).

У паэме ідэальнае каханне герояў надзвычай маляўніча дэкаруецца рамантычнымі топасамі жыццёвай прасторы, што дадаткова ўзмацняе пачуццё, праз якое героі здзяйсняюць сапраўдны прарыў да невычэрпнай, шматмернай і шматколернай матэрыі жыцця, спасцігаюць яго хараство і бясконцасць, захапляюцца дасканаласцю, эстэтычнай веліччу. І менавіта каханне надае жыццю паўнату і насычанасць, вітальна-містэрыяльную змястоўнасць, што вычарпальна раскрыта ў паэме.

Як адзначыў акадэмік Уладзімір Гніламёдаў, «у паэме "Яна і я" паэт уславіў дабрыню, хараство і маральны абавязак чалавека. Паэма раскрывае маральна-паэтычны свет зямнога існавання чалавека, радасць гаспадара і працаўніка. Аўтар паэтызуе жыццё і працу чалавека на зямлі, захапляецца вабнасцю зямнога кахання, непасрэднасцю пачуцця прыроды, хараством прыроднага ўлоння. Зямное быццё прадстае тут узнятым на крылах мары. ...[Купала] свядома робіць стаўку на ідылію. Апісанні падпарадкаваны лірычнаму выяўленню ўнутранага свету паэта, яго рамантычнага ідэалу, веры ў магчымасць жыцця шчаслівага і прыгожага»[3]. Даследчык робіць важнае ўдакладненне: асаблівую ўзнёсласць, урачыстасць паэмным апісанням надае той факт, што героі свабодныя. І таму ў Я. Купалы няма патрэбы згладжваць, абыходзіць сацыяльныя канфлікты, пазбягаць супярэчнасцяў. Натуральны стан сацыяльнай роўнасці, вольнасці выступае ў паэме крытэрам гармоніі і дасканаласці:

*Вялікі свет! Не згледзець тых абшараў,*
*Што прадзеды пакінулі і нам:*
*Дзе лес, дзе лозы, дзе ляжаць папары,*
*Дзе рунь абходзіць ўжо на хлеб людзям.*
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
*Багата мы з табою маем гоняў,*
*Ўпару абсеяць, зжаці толькі б іх*
*Ды ў добры час зблажыць у застаронне*
*Сям'ю снапкоў паспелых, залатых* (111).

Паэт наўмысна дыстанцыюецца ад сацыяльна-завостранага жыцця, малюе прыгожую гісторыю ідэальнага кахання, заглыбляецца ў прыватны, індывідуальна-інтымны свет чалавека. Такое непрыманне, забыццё рэальнасці бачыцца як рэакцыя на ліха, спустошанасць, вычарпанасць гэтай рэальнасці, аднаўленне яе ў імя асалоды натуральна-прыроднага жыцця, зачараванасці яго рамантычна-ідэалізаванай стыхіяй.

Мастацка-вобразны свет паэмы актыўна працуе на стварэнне дасканалай і велічна-універсальнай мадэлі ідэальнага існавання, мара пра якое суправаджае ўсю гісторыю чалавецтва. Янка Купала раскрыў такую мару як глыбока асабістую, інтымную патрэбу чалавечага "я" – духоўна развітой, прыгожай і гарманічнай, этычна дасканалай асобы ў яе "абсалютнай патрэбе лепшага свету" (Ё. Фіхтэ). Дзеля гэтага ўся стракатая рэчыўная дадзенасць і разнастайнасць твора праз фактуру і асабліваcці паэмна-рамантычнага жанру трансцэндэнтуе ў духоўную плоскасць і так універсалізуецца:

*І думка ўвысь ляціць на вольных крыллях,*
*Як бы самому Богу мела расказаць*
*Аб тых нягаданага свята хвілях,*
*Якім вясна яе умела счараваць.*

*Ляці, імчыся, думка, вышай, далей,*
*Як вокам стрэліць можна у блакітну даль!*
*Схапі стуль песню з перуновай сталі*
*І прынясі мне волю сільную, як сталь!* (119).

Створаны Янкам Купалам вобраз Беларусі нагадвае не ўласна краіну ў яе канкрэтна-гістарычнай рэалізацыі і прасторава-часавым вымярэнні, а найперш ідэальную мадэль як змястоўна-эстэтычны, маральна-этычны эталон паўнакроўнага нацыянальнага быцця. Менавіта такім чынам ідэйна-мастацкі змест паэмы зніставаны з актуальнымі праблемамі нацыянальна-культурнага, духоўнага адраджэння, задачамі фармавання нацыянальнай свядомасці.

Не ўсё ў творы так бясхмарна-ідылічна, як здаецца. Фінальнага ўражання бесклапотнага аазіса, замкнутага свету шчаслівага няведання мастацкія малюнкі паэмы не даюць. Урачыста-прыўзняты гімн жыццю, каханню, сусвету паэт заканчвае ў напружана-трывожнай танальнасці, фіксуючы стан адвечнага супрацьстаяння, змагання дабра і ліха. Таму паэмны лад жыцця не падаецца бесклапотна-ідылічным і тым больш не ўспрымаецца як утопія. Ён пульсуе мноствам сэнсава-пачуццёвых сфераў. Янка Купала стварыў паэму са свядомай "стаўкай на ідылію", аднак і з абвостраным успрыманнем усіх дысгарманічных і канфліктных момантаў нацыянальнага быцця, не даючы шанцаў на паблажлівасць, прымірэнне і заспакаенне:

*А воля мне жалезная патрэбна*
*За крыўды маёй мілай помстай заплаціць,*
*Што гаравала так яна бясхлебна,*
*Што ланцугамі мусіла шмат лет званіць* (119).

У рамантычна-ўзнёслым выяўленні самабытна-нацыянальнага як прынцыпова і сутнасна ідэальнай катэгорыі Янка Купала кіраваўся універсальнымі мастацка-эстэтычнымі катэгорыямі. Пры гэтым эстэтычная канцэпцыя жыцця з'явілася крытэрам паэтычна-сімвалічнага ўспрымання і ўвасаблення ім нацыянальнага свету, спрыяючы высокамастацкаму раскрыццю сілы, велічы, фундаментальнасці, магутнага духоўнага, этычнага, быццёва-прыроднага патэнцыялу нацыі.

---

[1] **Купала Я.** Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 6. – Мінск: Маст. літ., 1996. С. 117. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем старонкі ў дужках.

[2] **Гапава В.** Перачытваючы спадчыну Янкі Купалы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. С. 40.

[3] **Гніламёдаў У.** Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію. – Мінск: Бел. навука, 2001. С. 74 – 76.